**А. А. Крыварот**

# БЕЛАРУСКІЯ ПАРТЫЗАНЫ І ПОЛЬСКАЕ ПРАСАВЕЦКАЕ ПАДПОЛЛЕ: ПРАБЛЕМЫ ДАСЛЕДАВАННЯ ЎЗАЕМААДНОСІН

Праблема антыгерманскага ўзброенага супраціўлення на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны па-ранейшаму прыцягвае да сябе ўвагу гісторыкаў, архівістаў, краязнаўцаў. Разам з падраздзяленнямі савецкіх партызан тут дзейнічалі прасавецкія польскія падпольныя і партызанскія адзінкі, якія не падпарадкоўваліся польскаму эміграцыйнаму ўраду ў Лондане. Цікава вызначыць асаблівасці фарміравання гэтых адзінак у розных рэгіёнах Беларусі і тое, якім чынам будаваліся іх узаемаадносіны з беларускім партызанскім і падпольным рухам.

Некаторыя звесткі аб узаемадзеянні партызан Беларусі і прасавецкага польскага падполля прысутнічаюць у працах З. Барадзіна [1], Я. І. Сямашкі [2], у брашуры Г. Дз. Кнацько [3]. Варта адзначыць зборнік «В едином строю» [4], дзе сабраны шматлікія ўспаміны аб удзеле польскіх падпольных структур у савецкім партызанскім руху на акупаванай тэрыторыі Беларусі. Аднак названая праблема да гэтага часу асобна не даследавалася.

Да пачатку нямецкай акупацыі на тэрыторыі Заходняй Беларусі пражывала вялікая колькасць палякаў. Сярод іх былі як мясцовыя жыхары, так і тыя, хто з розных прычын апынуўся ў рэгіёне пасля захопу германскімі войскамі цэнтральных раёнаў Польшчы ў верасні 1939 г. З першых месяцаў германскай акупацыі заходнебеларускіх рэгіёнаў прасавецкі настроеныя палякі аказвалі разнастайную дапамогу партызанскім групам, сфарміраваным у 1941 г. з воінаў-акружэнцаў і мясцовых жыхароў. Перадавалі зброю, адзенне, медыкаменты. Ва ўмовах германскай акупацыі палякі стваралі аўтаномныя падпольныя і партызанскія структуры ці ўступалі ў беларускія партызанскія фарміраванні, з ліку якіх нярэдка арганізоўваліся аддзяленні, узводы, роты і нават атрады. Іх называлі яшчэ «зялёнымі». Варта азначыць, што існавалі і складанасці далучэння палякаў да савецкага партызанскага руху, што тлумачылася дзейнасцю на тэрыторыі заходніх абласцей Беларусі Арміі Краёва (АК). Кіраўніцтва гэтай арганізацыі неаднаразова заяўляла, што менавіта ў АК павінны быць палякі [4, с. 15].

Узаемадзеянне палякаў з беларускімі партызанамі і падпольшчыкамі адбывалася шмат у якіх рэгіёнах акупаванай германскімі войскамі тэрыторыі Беларусі, але найперш на захадзе рэспублікі. Кантакты беларускіх партызан з польскімі партызанскімі і падпольнымі групамі прасавецкай арыентацыі сталі наладжвацца з лета 1942 г. Найбольшая колькасць такіх кантактаў адбывалася на тэрыторыі Баранавіцкай вобласці. Па некаторых звестках у партызанскіх фарміраваннях дадзенага рэгіёна змагалася каля 500 палякаў. Так, на тэрыторыі Мірскага раёна непадалёку ад месца базіравання партызанскай групы, з якой у верасні 1942 г. аформіўся атрад «Камсамолец» (камандзір А. Саяцэвіч), размяшчалася польская партызанская група колькасцю каля 20 чалавек на чале з Ю. Мархвінскім. Палякі сумесна з байцамі беларускага атрада ўдзельнічалі ў баявых аперацыях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Першыя сумесныя баі былі праведзены ў жніўні–верасні 1942 г., калі партызаны напалі на нямецкія гаспадаркі ў населеных пунктах Обрынь, Рап'ёва, Краснагоркі, Некрашэвічы і спалілі вялікую колькасць звезенага з палёў неабмалочанага хлеба, разграмілі нямецкія склады з прадуктамі, падрыхтаванымі для адпраўкі ў Германію. Аб'ектамі сумесных удараў станавіліся таксама пункты сувязі на шашэйных дарогах Баранавічы–Мінск. Буйная сумесная аперацыя адбылася 10 снежня 1942 г., калі тры беларускія атрады і група Ю. Мархвінскага нанеслі ўдар па даволі моцнаму апорнаму пункту праціўніка ў населеным пункце Турэц. У выніку цяжкага і напружанага бою партызаны разбурылі маслазавод і нямецкую ўправу. Аднак асноўныя сілы акупантаў умацаваліся ў мураваным будынку, адкуль іх не ўдалося выбіць. Пры вяртанні на свае базы партызаны разграмілі паліцэйскі пост у вёсцы Ярэмічы. Пазней група Ю. Мархвінскага перабралася на поўнач Налібоцкай пушчы і ўдзельнічала ў фарміраванні атрада «26 год Кастрычніка» ў складзе брыгады імя В. П. Чкалава [2, с. 130–131; 4, с. 228; 5, с. 214–215].

У раёне Налібоцкай пушчы яшчэ летам 1942 г. разгарнула сваю дзейнасць падраздзяленне пад камандаваннем А. Свентаржыцкага, у якім большасць складалі палякі з Валожынскага і Івянецкага раёнаў. Атрад у колькасным складзе 55 чалавек з ліпеня па верасень 1942 г. уваходзіў у склад АЗПА, а затым быў расфарміраваны. Групы А. Свентаржыцкага і Я. Дз. Васюціна да канца 1942 г. дзейнічалі самастойна, а затым увайшлі ў склад брыгады імя В. П. Чкалава. Трэба адзначыць, што А. Свентаржыцкі пэўны час быў прыхільнікам АК, але затым скончыў сувязь з гэтай структурай. З мэтай правядзення агітацыйна-прапагандысцкай работы сярод польскага насельніцтва вясной–летам 1943 г. камандаванне брыгады з дазволу Баранавіцкага падпольнага абкама КП(б)Б арганізавала некалькі рэйдаў партызанскай разведгрупы А. Свентаржыцкага. Падраздзяленне здзейсніла паходы па тэрыторыі Валожынскага, Івянецкага, Стаўбцоўскага, Мірскага і іншых раёнаў вобласці. Партызаны-палякі інфармавалі насельніцтва пра зверствы нацыстаў у Польшчы, даводзілі зводкі аб сітуацыі на савецка-германскім фронце, раздавалі тэксты зваротаў «Саюза польскіх патрыётаў»

(СПП), сфарміраванага 1 сакавіка 1943 г. у Маскве, крытыкавалі палітыку польскага эмігранцкага ўрада ў Лондане. Рэйды адыгралі прыкметную ролю ў справе далучэння палякаў да ўзброенай барацьбы супраць акупантаў. У ліпені 1943 г. група мела ў сваім складзе 50 байцоў. Для партызан-палякаў камандаваннем брыгады быў устаноўлены спецыяльны знак адрознення – бела-чырвоная стужка на фуражцы [1, с. 72–73; 4, с. 188; 6, с. 380].

Група палякаў А. Свентаржыцкага нярэдка ўдзельнічала ў баявых аперацыях. Так, падчас правядзення агітацыйных рэйдаў група нападала на паліцэйскія патрулі і пасты. Разам з атрадамі брыгад М. І. Грыбанава і П. І. Гулевіча палякі ўдзельнічалі ў жорсткіх баях супраць карнай экспедыцыі «Герман» (1.07–11.08.1943). Разведгрупа праціўніка колькасцю 40–60 чалавек пад выглядам польскіх партызан пранікла ў раён вёскі Печышча з боку Углоў і наскочыла на засаду польскай групы на чале з Ю. Мархвінскім. Гэта група вясной 1943 г. перабралася са Стаўбцоўскага раёна на поўнач Налібоцкай пушчы і ўлілася ў брыгаду імя В. П. Чкалава. У выніку бою немцы страцілі два чалавекі забітымі, а польская група была вымушана адыйсці ўглыб лесу. Група А. Свентаржыцкага ўзаемадзейнічала з партызанамі атрада імя С. М. Кірава (камандзір Я. Д. Васюцін) у раёне вёскі Печышча пры абароне партызанскага аэрадрома. Позняй восенню 1943 г. на аснове падраздзялення польскіх партызан быў сфарміраваны атрад «26 год Кастрычніка» ў складзе амаль 100 чалавек. Ва ўзнагародным лісце на Ю. Мархвінскага адзначана, што ён займаў пасаду камандзіра гэтага атрада. У даведніку «Партизанские формирования...» датай арганізацыі атрада названа 26 кастрычніка 1943 г., а вось прозвішча камандзіра І. Л. Еўсцягнеева ўказана толькі з сакавіка 1944 г. і адсутнічае згадка пра тое, што раней гэту пасаду займаў Ю. Мархвінскі. Атрад быў сфарміраваны на базе групы палякаў, а ў даведніку ўказана толькі аб афармленні падраздзялення на базе рэзервнай групы брыгады. Партызаны атрада актыўна займаліся дыверсіямі на чыгуначных лініях. На баявым рахунку падрыўных груп 4 знішчаныя і выведзеныя са строю эшалоны з жывой сілай і тэхнікай, 11 разбітых вагонаў і некалькі платформаў. На шашэйных дарогах партызанамі беларуска-польскага атрада ўзарвана 6 аўтамашын, забіта і паранена больш за 50 акупантаў [4, с. 190, 197; 6, с. 381; 7, л. 95, 245].

На тэрыторыі Налібоцкай пушчы базіраваліся яшчэ некалькі польскіх партызанскіх груп, якія затым па загадзе камандавання перабраліся на мяжу з Беластоцкай вобласці. Адно с такіх падраздзяленняў пад камандаваннем П. Крэты здзейсніла марш у заходнім напрамку вясной 1944 г. На новым месцы дыслакацыі на аснове групы П. Крэты пры Антыфашысцкім камітэце польскіх патрыётаў быў створаны атрад імя В. Васілеўскай (камандзір В. І. Альхімовіч). Польскае падраздзяленне дзейнічала ў Шчучынскім, Васілішкаўскім і Радунскім раёнах, дзе праводзіла агітацыю сярод мясцовага насельніцтва і баявыя аперацыі. Асноўная ўвага звярталася на нанясенне ўдараў па камунікацыях праціўніка на чыгунцы і шашэйшых дарогах. У чэрвені 1944 г. партызаны на чале з намеснікам камандзіра атрада

К. Марцінкевічам узарвалі нямецкі эшалон з аўтамашынамі на перагоне паміж станцыямі Скрыбава–Жалудок. Група падрыўнікоў на чале з П. Крэта знішчыла мост на рацэ Котра каля вёскі Канюхі Скідальскага раёна.

З набліжэннем лініі фронту летам 1944 г. пры Баранавіцкім партызанскім злучэнні з палякаў былі створаны два падраздзяленні. Сярод іх асобны атрад, камандзірам якога стаў перакінуты з Вялікай зямлі Міхаіл Голдыс. Неўзабаве перад атрадам была пастаўлена задача на перамяшчэнне на тэрыторыю Польшчы. У апошнія тыдні акупацыі пры штабе злучэння быў створаны польскі батальён імя Т. Касцюшкі [1, с. 73; 4, с. 19, 202].

На працягу 1943 г. партызаны-палякі ваявалі ў многіх атрадах, якія базіраваліся ў розных раёнах Баранавіцкай вобласці. Польскі ўзвод, а потым рота (камандзір Я. Міканоўскі) былі створаны ў атрадзе імя Г. К. Жукава Баранавіцкай вобласці. У маі 1943 г. польскі ўзвод у складзе атрада ўдзельнічаў у падрыве эшалона з нафтай. У жніўні–верасні 1943 г. палякі вызначыліся ў «рэйкавай вайне». У лістападзе 1943 г. польская баявая адзінка ў складзе атрада рабіла напады з засады на нямецкі транспарт, які перамяшчаўся па шашэйных дарогах. У пачатку 1944 г. польская рота выконвала заданне па наладжванні сувязяў з партызанскімі атрадамі ў Слонімскім раёне. Пасля сустрэчы атрада імя Г. К. Жукава з часцямі Чырвонай арміі партызаны-палякі ўступілі ў Войска Польскае. Нягледзячы на тое, што ў некаторых беларускіх партызанскіх фарміраваннях знаходзілася нямала палякаў, асобныя падраздзяленні з іх ліку не ствараліся. Так, у брыгадзе імя А. В. Суворава было каля 50 палякаў, якія дзейнічалі ў розных атрадах. У брыгадзе імя В. І. Леніна ваявалі 13 байцоў-палякаў. Партызаны-палякі ў атрадах «Камсамолец» брыгады «Камсамолец», «1 Мая» брыгады «Перамога» разам з беларускімі партызанамі ў жніўні і верасні 1943 г. праводзілі дыверсіі на чыгуначнай лініі Стоўбцы–Гарадзея. Удалай сумеснай аперацыяй быў напад у ноч з 5 на 6 верасня 1943 г. на нямецкі гарнізон у Сялевічах каля Нясвіжа [2, с. 130–131; 3, с. 14; 4, с. 206–209; 8, л. 124].

На тэрыторыі Брэстчыны месцам узаемадзеяння беларускіх і польскіх партызан былі яе паўднёвыя раёны. У атрадзе імя Г. К. Жукава (камандзір В. В. Каткоў) з лета 1943 г. дзейнічала група падрыўнікоў-палякаў на чале з Ч. Шэляхоўскім. Ва ўзаемадзеянні з іншымі падрыўнымі групамі палякі правялі некалькі дыверсій на дарогах Брэст–Ковель, Брэст–Владава. Камандзір польскай групы навучыў мінна-падрыўной рабоце многіх партызан атрада і садзейнічаў стварэнню новых баявых адзінак. Дыверсійныя групы за кароткі тэрмін падарвалі чатыры воінскія эшалоны з жывой сілай і тэхнікай паміж станцыямі Хацісlaў і Забалацце, Маларыта і Хацісlaў. У раёне станцыі Пажэжына быў выведзены са строю паравоз, разбіта некалькі вагонаў з жывой сілай і 9 платформ з танкамі, а каля Забалацця партызаны падарвалі цягнік з афіцэрамі, якія накіроўваліся на адпачынак. Восенню–зімой 1943 г. беларускія і польскія партызаны сумесна правялі некалькі паспяховых аперацый супраць тылавых аб’ектаў акупантаў. Так, у кастрычніку быў ажыццёўлены напад на чыгуначную станцыю Дамачава. Польская

група першай праравалася на пуці, дзе знаходзіліся два эшалоны з харчаваннем і фуражом для адпраўкі на фронт, і падпаліла вагон з сенам. У выніку бою была разбурана станцыя, спалены вагоны, захоплена зброя і боепрыпасы. У лістападзе 1943 г. польская група падрыўнікоў і ўзвод партызан-палякаў (камандзір Р. Новік) агульнай колькасцю 56 чалавек удзельнічалі ў аперацыі па разгроме буйнога акупацыйнага гарнізона ў мястэчку Шацк Валынскай вобласці, які меў на ўзбраенні 8 кулямётаў і шмат аўтаматычнай зброі. Казармы былі акружаны акопамі, дзотамі, калючым дротам. У выніку нападу апорны пункт быў разгромлены і спыніў сваё існаванне. Нападаўшыя захапілі шмат зброі і абмундзіравання. У палон здаліся каля 80 казакаў. У баі партызаны страцілі 20 чалавек забітымі і 20 параненымі. У гэтым баі вызначылася група падрыўнікоў на чале з Ч. Шэляхоўскім. Значнаму павелічэнню колькасці палякаў у атрадзе паспрыяў разгром нямецкага гарнізона ў Маларыце. Падчас аперацыі ў снежні 1944 г. партызаны разграмілі дэпо, разбілі маслазавод, дапамаглі 40 палякам-работнікам аэрадрома сысці ў партызанскі атрад. Такая колькасць палякаў у партызанскім атрадзе дазволіла ў студзені 1944 г. стварыць роту палякаў на чале з Чэславам Шэляхоўскім. У роце было тры ўзводы, у кожным з якіх па тры аддзяленні. Заняткі з польскімі байцамі праводзіліся на польскай мове. У чэрвені 1944 г. амаль усе палякі, што прыйшлі ў партызанскае падраздзяленне з нямецкага аэрадрома, перайшлі ў атрад імя В. Васілеўскай. У сувязі з гэтым у польскай роце атрада засталося два ўзводы. Пасля арганізацыі на базе атрадаў імя Жукава і Варашылава брыгады імя В. І. Леніна польская рота была расфарміравана [4, с. 26–27, 33, 36, 38, 41, 46, 48, 52; 9, с. 271–272, 275, 282; 10, с. 148].

Некаторыя партызанскія і падпольныя групы палякаў імкнуліся да стварэння сваіх атрадаў. Адначасова іх камандаванне было настроена на шчыльнае супрацоўніцтва і ўзаемадзеянне з беларускімі атрадамі. Напрыклад, польская група «Юра» пад камандаваннем З. Карліцкага (па некаторых дадзеных В. Збілюта) мела значны рэзерв, бо на тэрыторыі Жабінкаўскага раёна і па суседстве з ім жылі каля ста палякаў, якія дзейнічалі ў якасці партызанскіх сувязных, з’яўляліся членамі падполля. Некаторы час гэта польская адзінка адносіла сябе да падраздзялення АК. З вясны 1943 г. група стала праводзіць дыверсіі на чыгунцы і шашэйных дарогах і ўзаемадзейнічала з атрадам імя М. М. Чэрнака, а ў пачатку снежня 1944 г. пасля цяжкага бою з карнікамі ўвайшла ў яго склад. У атрадзе з палякаў была створана асобная рота (камандзір З. Карліцкі). Для ўкамплектавання падраздзялення камандаванне атрада дапоўніла яе склад партызанамі польскай нацыянальнасці з іншых рот. У польскім падраздзяленні была створана спецыяльная дыверсійная група на чале з У. Грывач. Гэтая група ва ўзаемадзеянні з іншымі групамі атрада пусціла пад адхон некалькі эшалонаў праціўніка. Найбольш удалай была аперацыя ў ноч з 29 на 30 студзеня 1944 г., калі непадалёку ад станцыі Жабінка ў напрамку вёскі Панцюхі група У. Грывача пусціла пад адхон варожы эшалон з боепрыпасамі і жывой сілай. Яшчэ адна

польская дыверсійная група (старшы Шэліга) гэтага ж атрада свой першы ваенны цягнік падарвала сумесна з беларускімі партызанамі ў снежні 1943 г. каля вёскі Багуславічы на лініі Жабінка–Кобрын. У пачатку сакавіка 1944 г. польская рота ў складзе 60 чалавек знаходзілася ў раёне вёскі Вярхі, дзе дыверсійнай групай на чале з Шэлігам быў падарваны эшалон з афіцэрамі і салдатамі, якія накіроўваліся на велікодны адпачынак у Германію. У выніку аперацыі былі ліквідаваны некалькі дзясяткаў германскіх ваеннаслужачых, а рух цягнікоў быў спынены амаль на суткі. У сярэдзіне сакавіка 1944 г. большая частка роты ў сувязі з карнай экспедыцыяй перамясцілася на ўсход і, знаходзячыся на поўдзень ад Пінска, злучылася з часцямі Чырвонай арміі [3, с. 14; 4, с. 56, 60, 66, 70–71; 10, с. 126; 11, с. 247–248].

Актыўна дзейнічалі прасавецкія польскія падпольныя і партызанскія адзінкі на тэрыторыі Пінскай вобласці. Адно з першых польскіх партызанскіх падраздзяленняў у рэгіёне было створана ў маі 1943 г. на сходзе жыхароў у вёсцы Вялікая Глуша. У першы час група колькасцю 20 чалавек дзейнічала самастойна і ўзаемадзейнічала з беларускімі партызанамі. Ужо ў трэцяй дэкадзе мая 1943 г. беларускія партызаны з атрадаў імя Г. К. Арджанікідзе, імя С. Г. Лазо, імя А. В. Суворава і польская група аказвалі супраціў карнікам падчас аперацыі ў раёне Дняпроўска-Бугскага канала. У канцы ліпеня – пачатку жнўня 1943 г. быў арганізаваны польскі партызанскі атрад імя Т. Касцюшкі (камандзір Ч. Вархоцкі). Аб значнасці падзеі сведчыць тое, што ва ўрачыстай цырымоніі з гэтай нагоды прынялі ўдзел сакратары падпольных райкамаў КП(б)Б, камандаванне беларускіх партызанскіх фарміраванняў, а таксама камандзір Валынскага партызанскага злучэння Герой Савецкага Саюза А. Ф. Фёдараў са сваім штабам. Неўзабаве пасля арганізацыі Пінскай партызанскай брыгады польскі атрад увайшоў у яе склад. У далейшым атрад сумесна з партызанамі брыгады ўдзельнічаў у праведзенні дыверсій на камунікацыях, аперацый супраць акупацыйных гарнізонаў. Усяго падчас удараў па чыгунцы атрад імя Т. Касцюшкі падарваў 12 эшалонаў. Некалькі разоў польскае падраздзяленне на тэрыторыі Беларусі праводзіла баі з адзінкамі АУН-УПА. У ліпені 1944 г. большая частка атрада імя Касцюшкі была перакінута далей на захад [4, с. 101–113; 10, с. 614–615].

На базе польскага атрада імя Т. Касцюшкі вясной 1944 г. фарміравалася спецыяльнае падраздзяленне, якое планавалася выкарыстаць для пашырэння партызанскага руху на Любліншчыне. Было арганізавана фарсіраванае навучанне моладзі-дабраахвотнікаў. Некалькі разоў атрад імя Т. Касцюшкі атрымліваў на парашутах зброю – новыя аўтаматы, кулямёты Дзягцярова і вялікую колькасць боепрыпасаў. Праз некаторы час каля 100 партызан атрада перайшлі за Буг для ўмацавання дзеючых там атрадаў Гвардыі Людовай. Пасля злучэння з часцямі Чырвонай арміі польскі атрад быў накіраваны ва ўкраінскі горад Роўна, дзе знаходзіўся штаб польскага партызанскага руху. Адтуль 97 партызан на чале з камандзірам Ч. Клімам былі перакінуты на Любліншчыну для ўмацавання атрадаў Арміі Людовай. Астатнія ўступілі ў склад Войска Польскага [4, с. 125, 130].

Яшчэ адзін польскі атрад на тэрыторыі Піншчыны быў сфарміраваны ў студзені 1944 г. пасля таго, як акупантам удалося натрапіць на след Лагішынскай падпольнай антыфашысцкай групы, якая афармілася вясной 1942 г. і налічвала 20 чалавек. Падпольшчыкі займаліся сабатажам, дыверсіямі на камунікацыях і іншых аб'ектах акупантаў, збіралі для партызан зброю, разведдадзеныя, медыкаменты, ратавалі моладзь ад угону ў Германію. У сувязі з рэпрэсіямі падпольная група атрымала загад выйсці ў партызанскую зону. Камандаванне брыгады і Лагішынскі падпольны РК КП(б)Б атрымалі дазвол ад Пінскага падпольнага абкама КП(б)Б на арганізацыю польскага атрада, аснову якога склалі лагішынскія падпольшчыкі. Камандзірам атрада, які атрымаў назву Лагішынскі, стаў Аляксей Жылевіч. Раней ён быў кіраўніком польскай падпольнай групы. Партызаны Лагішынскага атрада непасрэдна ўдзельнічалі ў многіх аперацыях брыгады імя В. В. Куйбышава (камандзір У. М. Антановіч). Падрывалі масты, мініравалі дарогі, арганізоўвалі засады, знішчалі тэлеграфную сувязь на ўчастках Пінск–Лагішын, Лагішын–Ганцавічы, Лагішын–Целяханы. Беларускія і польскія партызаны неаднаразова рабілі вылазкі ў Лагішын для правядзення дыверсій. Сумеснымі намаганнямі быў пабудаваны палявы аэрадром, на які ў ноч з 28 на 29 красавіка 1944 г. прызямліўся першы самалёт са зброяй, боепрыпасамі, медыкаментамі, літаратурай. Напярэдані аперацыі «Баграціён» у ноч на 20 чэрвеня 1944 г. польскі атрад і партызаны брыгады праводзілі аперацыі на чыгунцы Лунінец–Пінск у раёне станцыі Парахонск. Лагішынскі атрад аперыраваў непадалёку ад чыгуначнага пераезду, на ўсход ад станцыі Гарадзішча. Польскія партызаны таксама вялі разведку ў інтарэсах штаба 61-й арміі 1-га Беларускага фронту. Падчас вызвалення войскамі Чырвонай арміі тэрыторыі Пінскай вобласці Лагішынскі атрад разам з іншымі атрадамі брыгады выконваў задачу па нанясенні ўдараў па адступаючых нямецкіх войсках у раёне Лунінец–Лагішын–Пінск. Непадалёку ад вёскі Багданаўка партызаны з засад раптоўна напалі на ўзмоцнены стралковы батальён і знішчылі дзясяткі акупантаў. Пасля расфарміравання брыгады імя В. В. Куйбышава многія партызаны Лагішынскага атрада пайшлі на захад і працягнулі барацьбу з гітлераўцамі на польскай тэрыторыі [4, с. 162, 164, 165, 175, 178; 12, с. 282–285].

Узаемадзеянне беларускіх падпольных і партызанскіх структур з польскімі падпольнымі групамі мела месца і на тэрыторыі ўсходніх абласцей Беларусі. Сюды немцы адпраўлялі палякаў у складзе дапаможных падраздзяленняў нямецкай арміі і рабочых каманд па рамонце чыгункі, шашэйных дарог і мастоў. Адна з такіх груп палякаў апынулася ў Чэрыкаўскім раёне. Прасавецкі настроеная група палякаў каардынавала свае дзеянні з чэрыкаўскімі падпольшчыкамі і перадавала партызанам боепрыпасы да трафейнай зброі, медыкаменты, соль. Беларускія партызаны і польская група-дарожнікаў на начных прыпынках нямецкіх калон арганізоўвалі пажары, прабівалі колы ў машынах, выпускалі бензін з бакаў, разражалі акумулятары. У маі 1943 г. чэрыкаўскія партызаны пачалі атрымлі-

ваць міны з савецкага тылу і польская група далучылася да ўдзелу ў дыверсіях на камунікацыях. У пачатку чэрвеня 1943 г. па прычыне неўзгодненых дзеянняў атрадаў 47-га «Перамога» (камандзір Ф. П. Ліпкін) і 720-га (камандзір Г. А. Храмовіч) не ўдалося правесці аперацыю паываду ў лес вялікай групы палякаў. Такі правал прывёў да арышту немцамі мясцовых падпольшчыкаў і палякаў-рабочых, многія з якіх пасля катаванняў былі забіты ці адпраўлены ў канцлагер [4, с. 360, 363, 366–367, 369–370].

Летам 1943 г. в партызанскій атрад «Іскра» (камандзір У. П. Дзярабін) брыгады «Разгром» Мінскай вобласці перайшла ўзброеная група палякаў, якая была мабілізавана ў нямецкую армію і знаходзілася ў гарадскім пасёлку Смалявічы. Гэта стала магчымым дзякуючы доўгай, карпатлівай і рызыкоўнай працы членаў ініцыятыўнай групы атрада на чале з І. Д. Мікалаевым. Больш за 10 палякаў (старшы У. Рачынскі) з першых дзён знаходжання ў падраздзяленні ўключыліся ў партызанскую барацьбу з акупантамі. Так, дзейнічая з засады на шашы Мінск–Магілёў каля населенага пункта Паплавы, беларускія і польскія партызаны разграмілі нямецкую калону і захапілі сем падвод з хлебам, 16 вінтовак, 2 аўтаматы, забілі і паранілі 18 акупантаў. Польскія байцы ўваходзілі склад груп падрыўнікоў падчас «рэйкавай вайны», удзельнічалі ў нападах на нямецка-паліцэйскія гарнізоны і іншыя тылавыя аб'екты гітлераўцаў [Там жа, с. 294–297].

На тэрыторыі Палескай вобласці ў пачатку 1942 г. былі ўстаноўлены сувязі калінкавіцкіх падпольшчыкаў з польскай рабочай камандай, асабовы склад якой знаходзіўся ў т. з. рабочых цягніках і дарожных групах. Некаторыя з іх заяўлялі, што гатовы змагацца з немцамі, але толькі ў складзе арміі генерала Андэрса. Не зусім удалым аказаўся выхад палякаў колькасцю 33 чалавек да беларускіх партызан. У сувязі з тым, што камандаванне атрада не мела магчымасці выканаць абяцаную падпольшчыкамі ўмову аб адпраўцы палякаў у савецкі тыл, частка з іх вярнулася і была схоплена гестапа. Астатнія палякі ўліліся ў партызаны. Нягледзячы на правал, калінкавіцкім падпольшчыкам удалося наладзіць сувязь з групай палякаў колькасцю 11 чалавек на чале Я. Зробекам. Група перадавала падпольшчыкам і партызанам патроны, узрыўчатку, медыкаменты. У канцы чэрвеня 1942 г. сумесна былі знішчаны пуцеправоды на чыгуначных участках Калінкавіцкі–Кацуры і Калінкавічы–Мазыр, праведзена дыверсія на вадакачцы ў Калінкавічах. Тром членам групы Я. Зробека ўдалося перайсці ў партызаны. Пазней немцы вывезлі астатніх польскіх рабочых са станцыі Калінкавічы ў невядомым напрамку [Там жа, с. 391–395]. У атрадзе № 132 (камандзір Р. І. Кравец) Петры-каўскай партызанскай брыгады ваявала група-рабочых з Лодзі. Яны прымалі ўдзел у разгроме нямецка-паліцэйскіх гарнізонаў, у дыверсіях, масіраванным удары па чыгунцы Жыткавічы–Калінкавічы 25 верасня 1943 г., знішчалі нямецкіх карнікаў у вёсках Брынеў, Белеў, Навасёлкі, Бобрык. Пры злучэнні палескіх партызан з часцямі Чырвонай арміі 10 ліпеня 1944 г. польскія патрыёты былі накіраваны ў часці Войска Польскага [Там жа, с. 396].

Фарміраванне польскага прасавецкага падполля на акупіраванай тэрыторыі Беларусі мела свае асаблівасці ў розных яе рэгіёнах. У заходніх абласцях Беларусі, дзе пражывала значная колькасць палякаў, як мясцовых, так і тых, хто туды перамясціўся ў выніку акупацыі гітлераўскай Германіяй Цэнтральнай Польшы, зачастую польскія падпольныя групы ўзнікалі самастойна і затым уступалі ва арганізацыйнае і баявое ўзаемадзеянне з беларускімі партызанамі. На тэрыторыі ўсходніх абласцей Беларусі польскія падпольныя структуры ўзнікалі з ліку асоб, якія апынуліся ў рэгіёне ў складзе дапаможных падраздзяленняў нямецкай арміі ці акупацыйных рабочых каманд па рамонце чыгункі, шашэйных дарог і мастоў. Стварэнне падпольных груп тут адбывалася шмат у чым дзякуючы арганізацыйнай рабоце беларускіх партызан і падпольшчыкаў.

## ЛІТАРАТУРА

1. *Барадзін, З.* Нёман – рака нязгоды / З. Барадзін ; пер. з польскай мовы. – СПб. : Невский Простор, 2018. – 333 с.

2. *Сямашка, Я. І.* Армія Краёва на Беларусі / Я. І. Сямашка. – Мінск : Хата, 1994. – 270 с.

3. *Кнацько, Г. Д.* Главное дело (вклад союза польских патриотов в СССР в создание демократической Польши) / Г. Д. Кнацько – Минск, 1988. – 25 с.

4. В едином строю : Воспоминания участников партизанского движения в Белоруссии. 1941–1944 / Г. Д. Кнацько. – Минск : Беларусь, 1970. – 531 с.

5. Памяць : Гіст.-дакум. хроніка Карэліцкага р-на. – Мінск : Ураджай, 2000. – 645 с.

6. Памяць : Гіст.-дакум. хроніка Сталбцоўскага раёна. – Менск : БэлЭн, 2004. – 832 с.

7. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 1450. Воп. 4. Спр. 305.

8. НАРБ. – Ф. 1450. Воп. 4. Спр. 307.

9. Памяць : Гіст.-дакум. хроніка Маларыцкага р-на. – Менск : Ураджай, 1998. – 535 с.

10. Партизанские формирования Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941–июль 1944) : краткие сведения об орг. структуре партиз. соединений, бригад (полков), отрядов (батальонов) и их личном составе / А. Л. Манаенков [и др.]. – Минск : Беларусь, 1983. – 765 с.

11. Памяць : Гіст.-дакум. хроніка Жабінкаўскага р-на. – Менск : Ураджай, 1999. – 510 с.

12. Памяць : Гіст.-дакум. хроніка Пінскага раёна. – Мінск : БЕЛТА, 2003. – 624 с.